№2 (2)
18 – 25 ліпеня 1995 г.

Выдаецца
на беларускай і рускай мовах

Тыраж 101.000 экз.
Кошт у розніцу 500 руб.

Народная Воля

ЗАСНАВАЛЬНІК ІОСІФ СЯРЭДЗІЧ

На следующей неделе по техническим причинам газета "Народная воля" выйдет не во вторник, а в среду.

Взгляд политолога

ТЬМА ВЛАСТИ,

или О пользе просвещенной политики

Президент своего добился. Вся власть в его руках. От парламента осталась одна только видимость. В бессмысленности своего существования новые и старые парламентарии уравнялись. Конституционный суд с таким успехом деполитизировался, что, на мой взгляд, потерял собственную значимость. Оппозиция после парламентских выборов, как после тяжкого похмелья. В партийных рядах, правда, наблюдаются разного рода мельтешения, скандальные разборки, перетасовки "вождей"и валтузня вокруг руководящих постов. Впрочем, серьезных партий как не было на Беларуси, так и сегодня нет. И сам народ президентом в общем-то пока доволен. И если не высказывает горячую поддержку по любому поводу, то безмолвствует или травит анекдоты. Значит, терпит и готов еще терпеть. А как обойти майский референдум, который стал настоящим триумфом любви народа к президенту?!

Чего еще, казалось бы, желать президенту? Все есть. Живи и радуйся. Власть -- удивительно обольстительная штука. К ней так же легко привыкнуть, как и трудно потом отвыкать. Вот и сегодня, когда наблюдаешь за президентом, его изменившимися манерами, слышишь этот претерпевший модуляции властный голос, создается впечатление, что ему на роду было написано быть президентом. Что так всегда было -- президент Лукашенко. И уже даже как-то неловко вспоминать мелкие стычки с парламентом, укрытые широкой ладонью президентские слёзы, размолвки с ближайшими соратниками... Сегодня все это далеко позади и кажется несообразной нелепостью. Сегодня уже не то что в президентском окружении не осталось дерзких вольнодумцев -- кто изгнан, кто сам ушел, -- сегодня без президента и абитуриенту житья нет. Потому что президент самолично зачитывает темы сочинений на вступительных экзаменах. А без высочайшего позволения управделами Ивана Ивановича, кажется, даже муха не смеет сесть на подоконник вверенных ему зданий. В государстве полный порядок. "Вопрос о власти решен, -- доносится из президентских коридоров, -- окончательно и безоговорочно".

Да я и сам готов пожелать президенту многие лета! Но не могу разделить этот победный пафос. Привычка власти и упоение властью -- быть может, самые коварные враги любого политика. В интересах президента не поддаваться обольщению. Нет раз и навсегда дарованной власти в цивилизованном государстве. За власть спрашивают по всей строгости. И то, что сегодня кому-то может показаться неиссякаемым источником народной любви и обожания президента, на деле оборачивается лишь отражением невротического сознания. Люди, загнанные в угол этой непонятной жизнью, мечутся и ищут спасения у президента -- сильного, уверенного в себе, способного говорить народным языком и убеждать. А если жизнь не пойдет на поправку, если она станет еще хуже, то этот источник в одночасье пересохнет. Народная любовь непостоянна. Впрочем, как и любовь вообще. По части улучшения жизни просвета пока не видать. Людей ведь не обманешь -- лишь 8-10 процентов, согласно опросам, утверждают, что им лучше живется при президенте. Все остальные пока, опять же, готовы терпеть.

Пойдем дальше. С давних времен известно, что власть легче завоевать, чем удержать. А еще и на благо народа распорядиться властью - и вовсе редкий дар. Признаюсь, лично у меня еще нет ответа на вопросы: "Какой власти добивается Президент?" и "Для чего нужна власть Президенту? Все еще ищу. Не хочу принимать худшее. Но скрывать не стану,иногда его действия просто пугают, и тогда кажется, что в президенте сидит слепой инстинкт силы и власти. Власть ради власти. Безропотное подчинение всех, выпяченный мессионизм, комплекс "отца народа"... Простым людям, пораженным кризисом, это, может, и нравится. Но формула "власть, помноженная на власть " в реальности всегда дает диктатуру. Поэтому я отказываюсь пока верить, что президент сознательно ведет дело к установлению диктатуры в Беларуси. Он изучал мировую историю и не может не знать, что все стяжатели власти плохо кончали. Если не при жизни, то в людской памяти, для Беларуси это обернулось бы невосполнимой потерей времени и сил. Опять же в цивилизованном государстве власть не может быть самоцелью. Власть есть лишь инструмент в достижении каких-то общественно значимых целей. Что взять с одной власти? Можно все и всем подчинить, разогнать непокорную прессу , выстроить по всем канонам властную "вертикаль", расставить по местам послушных наместников... Что дальше? Властью сыт не будешь, и на хлеб ее тоже не намажешь .

Прогресс в экономике, а значит, и улучшение жизни людей не появятся из одной голой власти, как Афродита из головы Зевса. Если за душой нет серьезной программы, если не выставлены ориентиры движения вперед, если не выработана модель будущего общества: куда идти и как идти, -- то и власть становится штукой бесполезной. Разве что ее как дубинку употребишь.

Не боюсь показаться "врагом демократии", но я даже был бы готов принять "чилийский" или "южно-корейский" путь развития Беларуси в ближайшие годы. Сильная, авторитарная власть меня не страшит в том случае, если она подчинена более значимой цели -- форсированному осуществлению реформ в экономике, формированию цивилизованного внутреннего рынка и интеграции в мировое экономическое пространство, хотя, с другой стороны, я верю в то, что нам незачем копировать опыт жестокосердечных генералов-реформаторов, и что уровень управляемости в республике и сама ментальность народа Беларуси, его традиционная лояльность к власти, позволяют нам на этапе реформ обойтись без насаждения авторитаризма, без урезания демократических свобод.

Но есть одно принципиальное отличие просвященного авторитаризма от заурядной деспотии и азиатчины -- временное ограничение демократии сопровождается предоставлением полной свободы предпринимательству, сохранением наиболее привлекательного инвестиционного климата в стране. Именно это принципиальное отличие как раз и остается непонятым президентским окружением. Позиция диктата, то же администрирование и те же повальные проверки определяют отношение президента к национальному бизнесу и предпринимательству. В своем недоверии и в стремлении подчинить себе президент уравнял бизнес и политическую оппозицию: "Хочу казню, хочу помилую." Об "экспроприаторской" деятельности президентского управделами И.Титенкова, для которого не существует различия в формах собственности, впору уже легенды слагать: если так пойдет и дальше, то скоро вся республика станет одним сплошным Управлением делами.

Конечно же, из всего можно извлекать политические дивиденды, в том числе, раскызывая народу о том, как президент ставит на место этот "зажравшийся" бизнес. Но в реальности политика тотального прессинга со стороны государства в отношении частного бизнеса и предпринимательства может привести только к катастрофическому сужению налоговой базы и сокращению притока инвестиций. И крайним опять окажется народ. Ему не достанется средств. Люди могут не не понимать эту диалектику, но президент должен.

Второе принципиальное отличие просвещенного авторитаризма от "тюбетеечного" деспотизма в том, что, как мы уже отмечали, власть не существует сама по себе, она служит программе реформ. У президента такой последовательной программы действий нет. Есть одна только власть. Антикризисная программа, принятая под фанфары в прошлом году, провалилась. Давайте обойдемся без обиняков. Одержимость стабилизацией курса белорусского рубля лишь демонстрирует бессистемность в подходах нынешней власти к реформам, ее увлечение внешними эффектами. Можно с помощью жесткого администрирования двигаться "впереди планеты всей" в области снижения инфляции за столь короткое время и теми же методами держать на приколе курс национальной валюты к доллару, но и первое, и второе -- лишь часть макроэкономического инструментария реформ. Инфляция в определенных пределах, как и политика на понижение курса национальной валюты может сознательно использоваться в интересах реформ. Все ведь зависит от экономической конъюнктуры. Какой прок от такой стабильной национальной валюты, если тем самым мы гробим своего производителя-экспортера?

Думаю, президент и сам это понимает. Иначе бы не благословил разработку под эгидой своей администрации Национальной производственной программы (НПП). Есть надежда, что НПП, над которой трудятся многие известные экономисты-теоретики и практики, сможет дать Беларуси перспективу построения открытой экономики и цивилизованного рынка, обратить на пользу народа те громадные преимущества, которые заложены в белорусско-российских соглашениях. И вот тут не обойтись без твердой руки президента, без сильной власти в стране. Но я искренне хотел бы видеть своего президента просвещенным Реформатором.

Анатолий МАЙСЕНЯ.



Вясковае свята. Фота Сяргея ГЛОБЫ. (г. Вілейка)

Если верить социологам...

Чего опасаются белорусы?

Весьма показательными оказались результаты опроса взрослого населения Беларуси, проведенного недавно по общенациональной репрезентативной выборке (опрошено 1414 человек). Его организовал Независимый институт социально-экономических и политических исследований при содействии Международного центра частного предпринимательства (США). На вопрос "Чего Вы опасаетесь в ближайшем будущем?" 64,3 процента респондентов ответили: возможности недоступности продуктов питания и товаров первой необходимости из-за роста цен.

Население республики также обеспокоено возможностью экологической катастрофы — 53,4 процента, непомерного роста цен на коммунальные услуги — 47 процентов, угрозы гражданской войны — 47 процентов. 41,1 процента опрошенных опасаются стать жертвой возросшей преступности, 25,3 — возможности установления диктатуры, 23,7 — войны с другими странами, 20,1 — межнациональных конфликтов в Беларуси, 17,4 — потери денежных сбережений, 11,3 — того, что Запад купит почти всю собственность в Беларуси, 10,8 — что это сделает Россия, 8 процентов опасаются возможности международной изоляции Беларуси.

Лариса КЛЮЧНИКОВА,
Белинформ.

Госрэкет?

Тихиня сделал ход, Чигирь не спешит

После долгих мытарств многие из тех, кто в 1990 году стал владельцем облигаций беспроцентного целевого займа, наконец-то с облегчением вздохнули: Конституционный суд своим решением предложил Кабинету Министров выполнить обязательства перед теми, у кого государство забрало когда-то деньги и не выдало им ни машин, ни холодильников, ни пылесосов.

Тихиня и весь Конституционный суд сделали свой ход, очередной -- за премьер-министром Чигирем. Но, судя по всему, он не спешит. После заключения Конституционного суда прошел почти месяц, а из Дома правительства никаких новостей. Члены инициативной группы В.Кучинский, А.Цишкевич, В.Дрягин, Т.Ильева, Г.Горин, В.Кунцевич и многие другие по-прежнему вхолостую обивают пороги чиновнических кабинетов, в которых им дают понять, что вы скорее умрете, чем получите от государства свои автомашины, холодильники, пылесосы...

Но люди не сдаются, их не пугает даже смерть в правительственных коридорах. Несмотря на все, полны решимости своего добиться. На днях они направили письма в адрес президента, премьера, министра финансов, председателя правления республиканского Сбербанка и т.д. В них свои требования они изложили четко и ультимативно: "Мы предлагаем наиболее простую для государства форму расчета: выплата нарицательной стоимости облигации, выраженной в долларовом эквиваленте на момент приобретения в 1990 году".

Далее в письмах подчеркивается: "Считаем, что выплату необходимо производить, начиная с 1 сентября 1995 года... Вышеуказанные формы и сроки выплат по облигациям, предложенные нами, являются единственно приемлемыми для нас, так как мы пользуемся юридическим правом кредитора выбора сроков и форм расчета (товар или деньги), а должник (правительство) обязан выполнить наши требования в соответствии с действующим законодательством".

Не забыли держатели облигаций и о компенсационных выплатах: "Учитывая, что государство не выполнило своих обязательств по облигациям, мы вправе требовать от правительства выплату среднегодового банковского процента за пятилетний срок использования наших денег, что составляет 15 процентов от нарицательной стоимости облигации, выраженной в долларовом эквиваленте по курсу 1990 года".

Итак, хозяева облигаций ждут хода от М.Чигиря. Поторопитесь, господин премьер! Народ ждет.

Сергей КРАПИВНИЦКИЙ.

В южных районах Брестской и Гомельской областей начинается уборка зерновых культур.

Мінск, рэдакцыі газеты "Народная воля"

Юнацкага імпэту і саліднасці

Галоўнаму рэдактару газеты "Народная воля" сп. Іосіфу Сярэдзічу

Віншуем Вас з выхадам 1-га нумара газеты "Народная воля".

Ваша рашучасць і нязломнасць зрабілі магчымай новую сустрэчу грамадзян Беларусі са свабодным словам і незалежнай думкай.

Жадаем Вам і калектыву газеты творчых поспехаў, юнацкага імпэту, саліднасці і прафесіяналізму ва ўсім.

З павагай —

Г.КУНЕВІЧ,
старшыня праўлення Фонду падтрымкі дэмакратычных рэформ (Фонду імя Льва Сапегі),
А.ЗАВАДСКІ,
каардынатар праграм Фонду.

У "Народнай волі" павінен вітаць вольны дух беларускага народа!

Прачытаў з задавальненнем першы нумар "Народнай волі". Віншую галоўнага рэдактара І.Сярэдзіча і яго паплечнікаў журналістаў са святам, бо для калектыву рэдакцыі і нас, чытачоў, выход першага нумара "Народнай волі" -- гэта свята!

Жадаю калектыву "Народнай волі" поспехаў у працы, мужнасці і згуртаванасці для таго, каб "Народная воля" стала найпапулярнейшым выданнем.

У "Народнай волі" павінен вітаць вольны дух беларускага народа!

Міхаіл ЗАДРОЎСКІ,
ветэран вайны і працы, былы камуніст з 47-гадовым стажам, г.Мінск.

Отстаивайте свободу и демократию!

От всей души поздравляю с выходом в свет первого номера "Народной воли"! Восхищен мужеством и решимостью отстаивать ценности свободы и демократии в нашем "правовом" государстве. Искренне желаю больших успехов и творческих удач в столь нелегком, но благородном деле!

Первый номер "Народной воли" произвел на меня хорошее впечатление. Редакции удалось, на мой взгляд, реализовать в нем оптимальное соотношение серьезной и "развлекательной" проблематики. Мне, правда, хотелось бы видеть в газете больше политических материалов, но я понимаю, что в этом случае есть опасность потерять массового читателя. Поэтому я в общем поддерживаю ваше стремление "сделать такую газету, которая отвечала бы требованиям читателей самых разных вкусов" (надеюсь, что при этом будет соблюдаться мера: мне, скажем, меньше всего хотелось бы видеть в газете публикации, отвечающие вкусам "новых левых" -- для них в Республике Беларусь вполне достаточно иных изданий...).

Искренне —

Валентин ВЯЗОВКИН.

Я вам желаю...

Я поздравляю Вас с выходом первого номера газеты "Народная воля". Желаю новому изданию удвоенного уважения со стороны читателей. Уверен, что мрачные времена для нашего многострадального народа минуют и главными критериями оценки всех, в том числе и журналистов, будут профессионализм, порядочность и преданность.

Я был постоянным подписчиком "Народной газеты", теперь моей уважаемой газетой станет "Народная воля".

Понимаю, какие трудности Вам предстоит преодолеть, особенно финансовые. В трудную минуту не стесняйтесь обратиться к своим подписчикам и доброжелателям за помощью. Это дело сугубо добровольное. Я пенсионер, но всегда готов перечислить на становление газеты (помимо подписной стоимости) посильную сумму.

С наилучшими пожеланиями --
ветеран труда Михаил Константинович РУЖИЦКИЙ, г.Минск.

Ходзяць чуткі...

Леанід Сініцын, мабыць, хутка развітаецца з Аляксандрам Лукашэнкам

Пра гэта гаварылі і раней, а ў апошнія дні такую інфармацыю можна пачуць, як кажуць, на кожным вугле. Як стала вядома ад асоб, прыбліжаных да прэзідэнцкага двара, паміж Леанідам Сініцыным і Аляксандрам Лукашэнкам адбылася "мужчынская" размова, пасля якой кіраўнік адміністрацыі стаў збірацца ў адпачынак. Праз месяц ён можа вярнуцца ўжо ў іншы кабінет.

Калі верыць чуткам, то месца Леаніда Сініцына можа заняць сённяшні намеснік Старшыні Вярхоўнага Савета І.Бамбіза. І гэта верагодна. Успомніце сесію, на якой І.Бамбіза без усялякай меры падыгрываў прэзідэнту.

Не выключана, што ў былы будынак ЦК на вуліцу К.Маркса ў хуткім часе пераедзе і М.Мясніковіч, намеснік старшыні Кабінета Міністраў. Ён таксама можа заняць кабінет Л. Сініцына.

Ходзяць чуткі, што пасля Леаніда Сініцына прэзідэнцкі палац могуць пакінуць Віктар Шэйман і Іван Ціцянкоў. Што ж, "Мавр сделал свое дело, Мавр может уходить".

Мікалай ГРЫНЕЎСКІ.

Задумайся, дзяржава!

23 віды падаткаў даводзіцца плаціць сёння прадпрыемствам. Хто гэта вытрымае?

За апошнія шэсць гадоў з-за дарагавізны калгасы і саўгасы Віцебшчыны не набылі ніводнага збожжаўборачнага камбайна. Няўжо, як і ў далёкія часы, убіраць збожжавыя хутка давядзецца сярпамі?

Хачу спытаць...

Які ж колер у таварыша Грыгор'ева?

Прачытаў неяк у газеце беларускіх камуністаў "Товарищ" заметку пад назвай "Возвращайтесь -- вы не блудные сыны", дзе былых членаў КПСС, якія не выкінулі партбілеты і не "перафарбаваліся", заклікаюць рэгістравацца ў "абноўленай" ПКБ. "Партыя вас чакае!" -- ляментаваў аўтар, сакратар камуністычнай ячэйкі, відаць, малалюднай.

Ды і якімі гэтыя новыя "пярвічкі" могуць быць? Мяне, напрыклад, камуніста з 20-гадовым стажам, у партыю камуністаў і гвалтам не зацягнеш. Бо я ўжо не веру ні былым, ні цяперашнім "будаўнікам светлай будучыні". І на гэты недавер маю асабістыя прычыны...

У 1990--1991 гадах я звяртаўся з заявамі да тагачаснага першага сакратара Віцебскага абкама КПБ У.Грыгор'ева, дэпутата Вярхоўнага Савета СССР. Паведамляў яму аб службовых злоўжываннях майго начальніка, кіраўніка РБУ абласнога ўпраўлення бытавога абслугоўвання С.Казыры -- нягодніка з партыйным білетам, якіх у той час выявілася зашмат. Ніякага адказу ад галоўнага чыноўніка вобласці -- камуніста і саюзнага дэпутата -- не атрымаў. Адзінае, чаго дабіўся: выперлі мяне з работы "па скарачэнню штатаў"...

А былы "бацька" Віцебшчыны (па-сутнасці, вінаваты не толькі ў маіх асабістых няшчасцях, але і ў "развале", з якім цяпер абяцаюць пакончыць тыя ж "чырвоныя" і сам Грыгор'еў) цудоўна перанёс крах КПСС. Ягоныя паплечнікі -- "партайгеноссэ" на высокіх дзяржаўных пасадах -- уладкавалі лепшага сябра генеральным дырэктарам вытворчага аб'яднання "Даламіт", дзе ён і сядзеў больш трох гадоў.

Не, Уладзімір Віктаравіч не выкінуў у 1991 годзе свой партбілет. А каб ніхто не сумняваўся ў яго вернасці ідэалам марксізму-ленінізму, на ўсіх камуністычных сходках ля помніка Леніну ў Віцебску Грыгор'еў быў "штатным" прамоўцам.

Вядома, яму і такім, як ён, вельмі хацелася б вярнуць у сваё падпарадкаванне "блудных сыноў" -- былых камуністаў з ліку рабочых, калгаснікаў і іншых "простых" людзей, каб яны кармілі сваёй працай і сваімі ўзносамі "барацьбітоў за сацыяльную справядлівасць". Для гэтага патрэбна рэальная ўлада і не ў маштабах "даламітаўскай" Рубы, а на рэспубліканскім "Алімпе". Адчуўшы, што ў рабочым пасёлку да камуністаў ставяцца не надта сардэчна, таварыш Грыгор'еў хуценька змяніў афарбоўку, уступіўшы ў Сацыялістычную партыю. Але, паколькі пра гэтую арганізацыю ў Віцебску мала хто ведае, 20 сакавіка 1995 года Уладзімір Віктаравіч вырашыў зноў кінуцца ў абдымкі камуністаў: гавораць, што ён паслаў свайго "фельд'егера" ў Чыгуначны райкам ПКБ з просьбай перарэгістраваць "гаспадара" Рубы як былога члена кампартыі. Там далі "адлуп": калі хоча, маўляў, няхай сам прыйдзе, ды не ў райкам, а на сход партыйцаў. Гэта Грыгор'еву -- былому "шэфу" вобласці -- не ў нюх. Прыйшлося заставацца ў статусе члена кіруючага органа Сацпартыі.

Ён бы, пэўна, і да партыі аматараў піва прымкнуў, каб на гэты момант было выгадна. Дарэчы, быў такі эпізод у жыцці Грыгор'ева, аб якім ён сёння не хоча ўспамінаць. А калі б хто-небудзь з выбаршчыкаў-пенсіянераў, ветэранаў аб ім даведаўся, быць Уладзіміру Віктаравічу "бітаму".

Яшчэ не так даўно ён публічна заявіў, што працягвае руку БНФ на супрацоўніцтва, бо з'яўляецца прыхільнікам плюралізму. А ў час цяперашняй перадвыбарчай кампаніі паліваў партыю Пазьняка брудам... Вось чаго каштуе "ідэйнасць" наменклатуршчыка былой КПСС! Яна, гэтая ідэйнасць, як нутро ў заляжалага фарбаванага яйка, -- тухлая. І змяненне афарбоўкі з камуністычнай, чырвонай, на сацыялістычную, ружовую, не зменіць вартасці "тавару". Словам, тое ж смярдзючае яйка, толькі від збоку...

Праўда, начальнік "Даламіту" мог гэтай "касметыкай" і не займацца. І так перавага на выбарах у парламент была яму забяспечана. Бо незадоўга да першага тура галасавання правёў Грыгор'еў на "Даламіце" канферэнцыю, дзе ачумеламу ад цяжкіх перспектыў працоўнаму люду настойліва даводзілася, што цяпер аб'яднанне будзе акцыянерным таварыствам, а яно не зможа існаваць без "блату" ў сталіцы, дзе ролю "агента ўплыву" можна ўскласці на генеральнага дырэктара, калі ён атрымае дэпутацкі мандат.

О, людзі, наіўныя людзі! Верачы ў гэта, яны забыліся на тое, што абраны імі дэпутат можа адразу ж збегчы з "Даламіту" і атрымаць пастаянную пасаду ў парламенце. Што і патрэбна, відаць, Грыгор'еву, якому да пенсіі засталося якраз столькі, колькі складае тэрмін дэпутацтва. Бо Уладзімір Віктаравіч як былы першы сакратар абкама КПБ мае права ісці на "заслужаны адпачынак" раней за "простых" людзей. Такую льготу падараваў камсамольскім і кампартыйным чыноўнікам "дэмакратычны" кебічаўскі ўрад.

І ўсё ж не будзем гадаць -- пераедзе У.Грыгор'еў у Мінск ці не? Галоўнае, што ён ужо ў Вярхоўным Савеце. Пры вышэйшай уладзе, акрамя якой і да гэтага меў усё. Ну а "новым" камуністам разам з уладай хочацца атрымаць тое, што назапасіў Грыгор'еў за часы застою, перабудовы і "дэмакратыі" (да прыкладу, катэдж, прадбачліва закладзены на мяжы Віцебскай і Мінскай абласцей). І атрымаюць, паўтараючы пры гэтым, што гарой стаяць за лёс рабочага чалавека і ягоны дабрабыт. А тыя, што за іх галасавалі, зноў застануцца ў дурнях, як гэта было больш за 70 год запар...

Дарэчы, пасля выбараў група падтрымкі Грыгор'ева распаўсюдзіла ўлётку з падзякай усім, хто аддаў галасы за Уладзіміра Віктаравіча. Пры гэтым нібыта забыўшыся, што таварыш Грыгор'еў нядаўна зваўся членам кіруючага органа Сацыялістычнай партыі, ягоныя прыхільнікі (пэўна ж, з ягонага дазволу) заявілі, што новы дэпутат як быў, так і застаўся камуністам.

Дык за каго ж галасавалі жыхары Рубы? І які ўсё ж такі колер у таварыша Грыгор'ева?

Уладзімір ЖЫГУЛОЎ,
г.Віцебск.

Ніл ГІЛЕВІЧ:

“Я заклінаю вас: не слухайце лжэпракокаў, палітычных прайдзісветаў і авантурыстаў, якія абяцаюць нам рай у чужым шалашы!”



Ахопленыя настальгіяй па мінулым, многія грамадзяне ўсю віну за развал СССР і ліквідацыю камуністычнага ладу на яго тэрыторыі ўсё яшчэ ўскладаюць на трох “белавежскіх зуброў”. Гэтакія, ці бачыце, усесільныя валаты-валадары, што ў імгненне вока ліквідавалі самую вялікую і, бадай, ці не самую магутную дзяржаву — Саюз непарушны... Ну хоць бы ўспомнілі таварышы вучэнне марксізма-ленінізма аб рэвалюцыях — чаму і калі яны адбываюцца і перамагаюць. Ды калі б не было аб’ектыўных эканамічных і сацыяльна-палітычных умоў — ніякага “развалу” не адбылося б. Галоўных ініцыятараў “развалу” верны камунізму савецкі народ скруціў бы ў бараннi рог. Не кажучы пра 20-мільённую ідэйна маналітную КПСС, якая і сваімі сіламі справілася б. Але ў тым і справа, што народ “развальшчыкаў” не скруціў. Нават і не падумаў скруціць. Чаму? А таму што наіўна-сляпога камуністычна-савецкага народа ўжо не было. Ужо ён паспеў троху-патроху разуверыцца ў многім з таго, што яму дзесяцігоддзямі падавалася як “самае, самае, самае”. А ў першую чаргу разуверыцца ў сваіх родных партыйна-савецкіх правадырах, — і вялікіх, і сярэдніх, і дробных. Народ паспеў разгледзець, што ўладу — на ўсіх узроўнях — ужо даўно трымаюць у руках перараджэнцы і прыстасаванцы з партбілетамі ў кішэнях, якія прывыклі раскашавацца за кошт незлічонай масы больш-менш прыстойна апранутых і ў цэлым негаладных грамадзян. Вядома, народ не змешваў з імі тых, што ў партыю ўступілі не дзеля асабістых выгад, не з кар’ерысцкіх інтарэсаў, а каб і ў жорсткіх таталітарных умовах лепш паслужыць людзям і Айчыне. У тым ліку і роднай Беларусі, імкненню беларускай нацыі ацалець, выжыць і не сысці з гістарычнай арэны ў небыццё.

Адна з галоўных прычын, чаму развалiўся СССР, — ліквідацыя... беларускіх школ і вынішчэнне беларускай мовы ў Беларусі. Калі хто з чытачоў паспеў, прачытаўшы гэта, іранічна ўсміхнуцца і нават успамянуць чорта — не спяшайцеся, калі ласка. Тым, што сказаў, я ўсяго толькі канкрэтызую тэму. Удумайцеся — і можа, вам не здасца сказанае мной такім ужо наіўным і смешным. Вынішчэнне беларускай мовы ў Беларусі (украінскай на Украіне, латышскай у Латвіі, казахскай у Казахстане, кіргізскай у Кіргізіі і г.д., і г.д., і г.д.) было вынікам — падкрэсліваю — *пэўнай дзяржаўнай палітыкі, вынікам планамерна ажыццяўляемага курсу на асіміляцыю, дакладней — на русіфікацыю ўсіх этнасаў на тэрыторыі СССР і на ўтварэнне адзінай “новай гістарычнай супольнасці — савецкага народа”* (з адзінай, канешне, рускай мовай, а значыць — на ўтварэнне ў рэшце рэшт адзінага рускага народа). Шляхі і спосабы асіміляцыі былі самыя розныя: выкарыстоўвалася натуральная і непазбежная эканамічна-вытворчая і навуковая інтэграцыя, наўмысна арганізоўваліся пэўныя міграцыйныя працэсы (дыфузія этнасаў), апрача таго — поўнае засілле рускай мовы ў інфармацыйнай прасторы (кнігадрукаванне, прэса, радыё, тэлебачанне), а яшчэ — шматмільённая рускамоўная армія з яе ваеннымі гарадкамі, адзіны рускамоўны КДБ і многае-многае-многае іншае. Можа, хто скажа, што ў СССР не адбываўся менавіта **гэтакі** асіміляцыйна-русіфікатарскі працэс? Што справа не вялася да канчатковага сцірання самабытных абліччаў нацыянальных тэрыторый і да зліцця нацый з іх мовамі і культурамі ў адным катле? Толькі апошні бессаромны хлус стане адмаўляць гэта.

Іншая рэч, што кагосьці такая рэальнасць задавальняла. Маўляў, ну а што тут кепскага? “Зліёмся — і будзем жыць адным народам. Усе станем рускімі. Абы добра, заможна жыць, а ўсё іншае — яно сабе, можна змірыцца.” Ну, гэта ўжо як і кім хто пачуваецца і якую долю зычыць свайму народу. Калі хто жадае яму пагібелі — іменна як народу, як этнасу, — тады ўсё зразумела. Але... “Ніхто не хацеў паміраць” — так называецца вядомы кінафільм літоўца Жалакявічуса. І ніхто ніколі не захоча паміраць, добраахвотна сыходзіць у магілу. Ніхто: ні адна нацыя, ніводзін — ні вялікі, ні малы — народ. І адчуўшы, што яго хочуць загнаць у магілу гвалтам, што жыццё яго робяць такім, каб ён вырадзіўся і знік, што пад родным небам і на роднай зямлі яму не даюць быць самім сабою, — ён пачне супраціўляцца. Як толькі можа. Нават і гэтак, як у Чэчні. Так было адвеку. Так ёсць сёння. І так будзе заўсёды.

Мудрая руская прыказка кажа: “От добра добра не ищут”. Калі б было добра — на душы і на сэрцы — у народаў, што ўваходзілі ў Саюз, калі б душа не курчылася ў муках ад крыўды і болю, бачачы, што нават мовы ўласнай яе пазбаўляюць, — ну навошта было б шукаць нейкага іншага, большага дабра? Але ж — пазбаўляюць! Дый яшчэ цынічна-здзекліва заяўляюць, што гэта вы самі адмаўляецеся, самі выракаецеся, самі не хочаце быць сабою. Яшчэ і рэферэндум дапамогуць арганізаваць. Як у нас — у Беларусі. Удумайцеся толькі, людзі добрыя: давайце, кажуць, ураўняем статус рускай мовы са статусам беларускай. Калі гэты тэарэтычны тэзіс перакласці на мову рэалій, то будзе гучаць так: давайце і рускую мову выганім адусюль гэтак жа, як выгналі беларускую. Пазайздросцілі статусу беларускай мовы! Божа прасветлы!.. Давялі няшчасных людзей амаль да поўнага бяспамяцтва, пазбавілі нацыянальнай самасвядомасці, ператварылі ў манкуртаў, і прапануюць ім добраахвотна выявіць сваю волю наконт лёсу роднай мовы, наконт сваёй нацыянальна-гістарычнай сімволікі, наконт суверэннасці і незалежнасці сваёй краіны. Большага дзяржаўнага цынізму я за сваё жыццё не бачыў.

Вось пішу, можа быць, і ў соты раз аб гэтым — і зусім не ўпэўнены, што мае словы дойдуць да душы і сэрца тых, каму яны перш за ўсё адрасаваны. Дойдуць і зварухнуць сумленне, і прымусяць апомніцца і сказаць сабе, як сказаў на з’ездзе пісьменнікаў у Маскве сапраўды культурны рускі чалавек Сяргей Паўлавіч Залыгін: “То, о чем говорил здесь Нил Гилевич — это ужасно... Надо безотлагательно что-то делать, чтобы исправить положение, не дать умереть языку народа...”

Што ўзяліся “безотлагательно делать” нашы дабрадзеі ў Беларусі — мы ўжо бачым. Зноў усхадзіліся “ліквідатары”. Ужо загадана кіраўнікам адукацыі ў гарадах і вёсках рэспублікі забяспечыць права выбару мовы навучання ў дзяржаўных школах (падкрэсліваю — у дзяржаўных). На практыцы гэты выбар такі: беларускія класы ліквідуюцца, заяў ад бацькоў на беларускамоўнае навучанне не прымаюць. (Гл. “Сталіцу” за 30 чэрвеня г.г.). Пазіцыя больш чым ясная: можна тут жыць, працаваць, уладкоўваць свой дабрабыт — а мову гэтай зямлі ведаць неабавязкова. Лічыце, беларусы, сваёй дзяржаўнай мовай іншую — тую, што з’яўляецца дзяржаўнай у суседняй краіне. А мы паціху-патроху будзем рабіць усё для таго, каб і дзяржавы аб’ядналіся, зліліся ў адну. Тады само сабою адпадзе і моўнае пытанне. Колькі ні цягнецца гэта цынічнае хітраванне, як ні прыхоўваецца, ні маскіруецца яно прыгожымі словамі аб свабодзе, аб роўнасці, аб брацтве, а мэта застаецца адна і тая ж: Беларусь павінна стаць “северо-западным краем” ці проста адною з губерняў Расіі. Тым больш што кандыдата на пасаду губернатара шукаць не трэба будзе. “А Марките толечко моргните”, як пісаў славуты рэвалюцыйны паэт.

Недаацэнка моўнага фактара помсціць усім, нават і тым, а можа, і ў першую чаргу тым, хто стаіць на вяршыні піраміды. Мова — гэта магутная стваральная сіла. Мова — гэта тое, што аб’ядноўвае нацыю ў адно цэлае. Так ва ўсім свеце, у любой дзяржаве. У любой, але не ў нас. У нас мова не кансалідуе, а раз’ядноўвае. Кіраўніцтва дзяржавы робіць усё, каб праз мову гэтае раз’яднанне паглыбіць. Праведзены рэферэндум цалкам скіраваны на раскол нацыі, яго сумныя (і сумніўныя!) вынікі ўжо запрацавалі і будуць працаваць далей на раз’яднанне.

Некампетэнтнасць... Можа, і не самае дакладнае слова для характарыстыкі таго, што адбываецца на Беларусі. Можа, лепш падышло б нейкае іншае, не такое далікатнае слова. Калі кіраўніцтва дзяржавы не дапамагае свайму народу падняцца з каленяў, набыць пачуццё нацыянальнай годнасці, — што гэта? Калі кіраўніцтва дзяржавы не разумее глыбіннай сутнасці самой ідэі нацыянальнага адраджэння, яго філасофіі, — што гэта? Калі для кіраўніцтва дзяржавы найвышэйшы аўтарытэт у пытаннях нацыі, мовы, культуры — група жонак расійскіх афіцэраў, што завалодала тэлебачаннем і крычыць пра перавагі рускай мовы і рускай школы на Беларусі, — што гэта?.. Скажыце пра ўсё гэта прэзідэнту любой еўрапейскай дзяржавы і паслухайце, што ён вам адкажа.

Ды каб жа толькі кіраўніцтва дзяржавы стаяла на такіх пазіцыях! А паглядзіце, як зашчыравалі на карысць рэферэндуму многія журналісты, як узяліся адпяваць — і з экрана, і ў перадавых артыкулах, і ў персанальных калонках — “нацыянал-радыкалаў”! Ура, нацыянальная беларуская ідэя пацярпела поўны крах!.. Пацярпела? Вы ў гэтым упэўненыя? Ну, што вы, што вы, панове! Ваша радасць зусім дарэмная. Беларуская ідэя не пацярпела і ніколі не пацярпіць краху, запомніце гэта. Крах жа фактычна пацярпеў учарашні дзень Беларусі. Падлічыце, шаноўныя, колькі — які працэнт — маладых людзей прагаласавала на рэферэндуме “за” — за другую дзяржаўную мову, за старую бальшавіцкую сімволіку і інш. Падлічыце, калі ласка. Можа, тады пратраце вочы і задумаецеся над сваім творчым лёсам. Я сказаў “многія журналісты”, так, многія, але, на шчасце, далёка не ўсе. Больш таго, шмат ёсць і такіх, што выдатна бароняць годнасць і гонар беларускай журналістыкі. Асабліва — маладыя майстры газетнага і эфірнага слова, якіх я чытаю ці слухаю іншы раз проста з захапленнем. Паздароў іх, Божа, і дапамажы ім!..

У гэтай сітуацыі мяне, прызнаюся, здзіўляе і засмучае пазіцыя большасці беларускіх рэфарматараў, “рыначнікаў”, прадпрымальнікаў, бізнесменаў. Логікі не бачу ў вашых памкненнях і дзеяннях, шаноўныя. Вы змагаецеся за дэмакратызацыю грамадства, за эканамічныя рэформы, за правы чалавека, але і за дзяржаўнае двухмоўе, за рускую мову як мову вытворчасці, афіцыйных службаў, навукі і г.д. Вам не хочацца вывучыць беларускую мову, каб перайсці на яе ў сваёй прафесійнай дзейнасці. Ну што ж! Будзеце карыстацца мовай, якой звыкла карыстаціся дагэтуль, але ўжо не свабоднымі грамадзянамі, а паднявольнымі рабамі. Вы хочаце раз’яднаць, распалавініць свабоду: нацыянальнай эканоміцы, прадпрымальніцтву, гандлю — свабода, а нацыянальнай мове, нацыянальнай культуры — няволя, палон, прыгнёт. Так не бывае, шаноўныя! Свабода не дзеліцца. Больш таго, пачынаць трэба са свабоды душы, з суверэннасці духу, а мова і ёсць душа народа. Толькі свабодная душа даб’ецца палітычнай незалежнасці для Бацькаўшчыны, у якой і будуць створаны ўмовы для развіцця нацыянальнай эканомікі, прадпрымальніцтва, сацыяльнай сферы, навукі і адукацыі, культуры і мастацтва.

Вядома, пытанне не ставілася і не ставіцца так, як многія пішуць і гавораць: неадкладна ўсім перайсці на беларускую мову! Нічога такога не было, ніколі такое не патрабавалася. Паглядзіце, пачытайце Закон аб мовах. Хіба тэрміны, якія ў ім адведзены на аваладанне беларускай мовай, занадта жорсткія? Пяць-сем-дзесяць гадоў — гэта вельмі мала? Гэта можа быць мала толькі для тых, для каго і дваццаць, і трыццаць і сто гадоў мала, бо для іх ніякія тэрміны пераходу на беларускую мову непрымальныя. Зрэшты, з увагі на рэальную моўную сітуацыю, на тое, што з русіфікацыяй у нас зайшло надта далёка і выпраўляць становішча цяжка, — тэрміны па пэўных артыкулах Закона можна ж і павялічыць; той жа самы Вярхоўны Савет гэта спакойна зрабіў бы, не парушаючы прынцыпу, не збіваючы грамадства з прынятага курсу на нацыянальнае адраджэнне Беларусі. Але ж гэтак — давайце прадоўжым тэрміны! — пытанне нікім не ставілася; усе патрабаванні зводзіліся да аднаго: надаць і рускай мове статус дзяржаўнай! З вельмі зразумелых меркаванняў: гэтым самым беларуская мова, няздольная вытрымаць канкурэнцыю, будзе асуджана на пагібель і ёй ужо не дапамогуць ніякія тэрміны. Удар, які не ўдалося нанесці на сесіі пры прыняцці Канстытуцыі, нанеслі праз амаральна задуманы і арганізаваны рэферэндум.

Тое, што адбылося 14-га траўня 1995 года, — гэта, бясспрэчна, бяда, якая істотна ўскладніла і без таго цяжкае становішча незалежнай беларускай дзяржавы і яе народа. Але калі мы цяпер думаем, як наша становішча папраўляць, як дзейнічаць сёння і ў бліжэйшай перспектыве, каб не страціць сябе наогул, — трэба думаць пра бяду іншую, галоўную, без якое не было б і гэтай, “рэферэндумнай”.

Галоўная бяда наша (калі не трагедыя) здарылася ў сакавіку 1994-га, калі Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь прагаласаваў за прэзідэнцкую форму кіравання ў Беларусі. Гэта была найвялікшая і недаравальная памылка, нядобрыя, горкія, а то і страшныя наступствы якой мы будзем расхлёбваць роўна столькі, колькі гэтая форма дзяржаўнага кіравання ў нас будзе працягвацца. Ні ў якім разе, падкрэсліваю, ні ў якім разе нам, у Беларусі, нельга было гэта рабіць! Толькі парламенцкая рэспубліка! Прынамсі, на бліжэйшыя сто гадоў. Пакуль істотна не перайначыцца ў лепшы бок усё наша грамадства, не адродзіцца маральна, не ўздымецца духоўна і культурна. У крайнім выпадку маглі б “закласці” ў Канстытуцыі прэзідэнта з чыста прадстаўнічымі функцыямі, як, напрыклад, у Германіі.

Па дарозе да таго злашчаснага галасавання, і на пасяджэннях Прэзідыума, і на нарадах у Старшыні Вярхоўнага Савета я выказваўся рэзка супроць прэзідэнцкай формы кіравання, і затым адмовіўся браць індывідуальны, “пад распіску”, бюлетэнь для галасавання, за што быў “спляжаны” з трыбуны сесіі Вярхоўнага Савета на ўсю рэспубліку. На другі дзень пасля прыняцця новай Канстытуцыі ў інтэрв’ю газеце “Наша слова” (чыны яе не чытаюць) я патлумачыў сваю пазіцыю так (прашу прабачэння за самацытаванне): “Нам лепш мець формай дзяржаўнага кіравання парламент (...) Баюся, што прэзідэнт у нас хутка ператворыцца ў таго ”бацьку з палкай”, пра якога яшчэ Аляксей Талстой у сваёй “Истории государства российского” пісаў, маючы на ўвазе цара Пятра I. “Он молвил: мне вас жалко. Вы сгинете вконец. Но у меня есть палка. И я вам всем отец”. Пры нашым узроўні культуры і грамадскай маралі атрымаць такога “бацьку з палкай” — небяспека зусім рэальная. (...) Пераможа той, хто ўсю сваю перадвыбарчую праграму пабудуе на спекуляцыі сацыяльнымі бедамі нашых людзей, на сацыяльнай дэмагогіі". І далей: “ёсць небяспека, што ў нас на прэзідэнцтва можа прабіцца вельмі нядобры чалавек, які ў сацыяльнай дэмагогіі стрымліваць сябе не будзе, абяцанняў будзе даваць шмат: ”Вот давайце зломім-скрышым гэтых баламутаў-дэмакратаў, расправімся з імі канчаткова, навядзём парадак, і ўсё ў нас будзе выдатна!" А на аснове чаго будзе гэтае “выдатна”? На аснове тэрору? Калі не будзе каму сказаць слова праўды, тады лёгка будзе здаць краіну з усімі яе багаццямі суседняй дзяржаве." (“Наша слова” за 30 сакавіка 1994 г.).

На вялікі жаль, у сваіх трывожных прадбачаннях я не памыліўся. У ліпені 1994 года прэзідэнтам незалежнай Беларусі быў абраны чалавек, які тут жа абвясціў курс на аб’яднанне нашай дзяржавы з суседняй (“канфедэрацыя ці федэрацыя — гэта мы рашым пасля”) і тут жа збэсціў мову свайго народа, абазваўшы яе неразвітай і недасканалай. Вядома, гэтыя заявы першай дзяржаўнай асобы былі ўспрыняты цывілізаваным светам як нечуваныя і неверагодныя, як тое, што “проста ў галаве не ўкладваецца”. Рэагаваннем сусветнай супольнасці на іх было не толькі вялікае здзіўленне, але і глыбокае расчараванне, і астуда ў памкненнях да партнёрства і супрацоўніцтва, і шчырае спачуванне беларускаму народу, якому зноў “страшэнна не пашанцавала”. Расчараванне гэтае яшчэ больш паглыбілася пасля антыбеларускага і антыканстытуцыйнага рэферэндуму — акцыі сапраўды беспрэцэдэнтнай у гісторыі незалежных народаў. Падбіць мільёны недасведчаных у палітыцы людзей на тое, каб яны ўласнымі рукамі прыдушылі сваю родную мову і адрынулі сваю гістарычную сімволіку — канешне, на такую ініцыятыву патрэбна смеласць асобага роду. І не толькі ў ідэйна-маральным плане, але і ў эканамічным. Гэтай незвычайнай смеласцю у нас валодаюць многія. Пакінем на хвілінку маральны план убаку, пакіруемся інтарэсамі эканомікі. Помніце: “Кажуць, на замену сімволікі трэба вельмі шмат грошай. Хачу адказаць: прэзідэнт абяцаў сваім выбаршчыкам зрабіць гэта — і грошы на гэта знойдзе! Колькі б ні каштавала!” Так рашуча, агітуючы за рэферэндум, заявіў А.Р.Лукашэнка. Так рашуча, як бы справа ішла аб выратаванні жыцця цяжка хворых дзяцей. Ну, што ж, з ягонай вышыні лепш бачна фінансавае становішча краіны. І ўсё-такі хацелася б ведаць: дзе ж прэзідэнт іх знойдзе, гэтыя грошы? Дзе яны валяюцца — лішнія 1,5 трыльёна “зайчыкаў”? На мяжы поўнага паралічу эканоміка, тысячы дзірак-прарэх у сацыяльнай, экалагічнай, культурнай і іншых сферах, а тут — на чыстае палітыканства выкідваюцца казачныя сумы!..

Як сабе хочаце, шаноўныя грамадзяне, але калі і такое нас не бянтэжыць і не прымушае задумацца, то нам ужо не дапаможа ніхто. І спадзявацца на нейкае паляпшэнне нашага жыцця, нашага сацыяльнага становішча — звышнаіўнасць, каб не сказаць мацней.

Дэпутаты Вярхоўнага Савета “старога” склікання сёння абураюцца парушэннем Канстытуцыі, пратэстуюць супроць курса на дыскрэдытацыю і ліквідацыю заканадаўчай улады. Правільна: Канстытуцыю і законы трэба паважаць, — пратэст справядлівы. Але скажыце, шаноўныя калегі, дзе вы былі і што думалі 13-га красавіка, калі галасавалі за рэферэндум, у тым ліку — за яго чацвёрты пункт? Чым тады кіраваліся — якімі пачуццямі, якімі клопатамі? Тады вы не бачылі ўсю недарэчнасць, неразумнасць і марнасць навязаных ініцыятыў? Бачылі, канешне. Але... Лепш у тартарары, лепш агнём і дымам хай пойдзе ўсё жыццё наша, а толькі не зробім так, як прапануюць апазіцыянеры і “нацыяналісты”! Вось такая дзяржаўная мудрасць, такая логіка, такая смеласць... Ці сапраўды ўжо нейкае ачмурэнне найшло на нас і паралізавала нашу волю? Бо што яшчэ застаецца думаць, калі дарослым дзяржаўным мужам не хапае розуму нават на тое, што і дзецям малым зразумела: нельга, ну нельга ж, жабруючы і просячы дапамогі ў свеце, выкідваць на вецер — на вяртанне старой бальшавіцкай сімволікі — садраныя з падаткаплацельшчыкаў мільярды!

Куды ж мы ідзём, якое жыццё, які лад у сваёй краіне будуем, якую Беларусь хочам мець? Калі мы сапраўды хочам усталяваць на сваёй зямлі добры лад, годнае чалавечае жыццё — мусім зразумець адно: дасягнуць гэтага можна толькі на грунце беларускай ідэі, толькі ў сваёй незалежнай нацыянальнай дзяржаве. Пацвярджэннем гэтаму — гістарычны лёс як тых незалежных краін, якія ўжо даўно дасягнулі высокага дабрабыту, так і тых, якія хутка яго дасягнуць (Эстонія, Латвія, Літва). Выхаду з цяжкага крызіснага становішча трэба вучыцца ў тых, хто ўжо з яго выйшаў або паспяхова выходзіць. Не капіраваць, а вучыцца. Ці мы, беларусы, вучыцца ўжо няздольныя? Пры гэтым — будзем трымацца свайго ўласнага шляху, абавязкова ўлічваючы ўсё, што складае адметнасць нашай гісторыі, нашага менталітэту, нашага эканамічна-гаспадарчага досведу, нашага геапалітычнага становішча. Асабіста я ўпэўнены, што мы зробім свой беларускі дом заможным і ўтульным, калі ў аснову эканамічна-сацыяльнай праграмы закладзём усебаковую і ўсемагчымую стымуляцыю прадукцыйнасці працы і росту вытворчасці, абароненую законам свабоду творча-гаспадарчай ініцыятывы, а таксама — бясплатную адукацыю, бясплатнае карыстанне паслугамі медыцыны, даступную для ўсіх цану на кнігі, часопісы, газеты, тэатры, канцэрты і кіно. Без апошняга — без клопату пра духоўны рост асобы — усё астатняе траціць сэнс.

Паважаныя суайчыннікі, людзі зямлі беларускай! На схіле гадоў сваіх — я заклінаю вас: не слухайце лжэпракокаў, палітычных прайдзісветаў і авантурыстаў, якія абяцаюць нам рай у чужым шалашы! Не дайце ўвесці сябе ў зман, каб не страціць свае найвялікшыя святыні, а перш за ўсё нашу Богам дадзеную нам мову! Верце толькі тым і ідзіце толькі за тымі, для каго свабода і незалежнасць Беларусі даражэй за ўсё на свеце!

Вопрос к власти

Спасут ли экономику мусоропроводы?

Вышло в свет постановление Кабинета Министров N 359 от 4 июля 1995 года "Об упорядочении ставок квартирной платы и тарифов на коммунальные услуги".

В общем, документ как документ — нам не привыкать к спонтанному росту цен на товары и услуги. Конечно, прочитав, что к 60-процентной стоимости жилья добавляется еще 10-процентная стоимость пользования мусоропроводом и лифтом, кое-кто возмутится, особенно квартиросъемщики вторых этажей. Но ничего — привыкнут.

Удивляет другое. Оказывается, как подчеркнуто в постановлении, все это сделано "в целях обеспечения выполнения Программы неотложных мер по выходу экономики Республики Беларусь из кризиса..." Значит, экономику следует спасать не путем обновления основных производственных фондов, внедрения передовых технологий, повышения производительности труда и т.д. и т.п., а за счет и без того чрезмерно тощего кошелька граждан! Тогда почему остановились только на лифтах и мусоропроводах? Ведь если хорошо подумать, можно сюда присобачить, скажем, кубатуру квартир (у одних потолки — рукой достать, у других и не доплюнуть), переходы с лифтовых площадок на лестничные. А сколько потянут "незаконно" застекленные балконы и лоджии!

Короче говоря, с квартиросъемщика можно драть и драть и будет он платить как миленький, никуда не денется — бежать-то некуда. Так потихоньку наплюсуются все 100 процентов. Экономика резко рванет вперед, оглянется вокруг народ, а кризиса как и не бывало.

Валентин ЛЕГЕЗА, житель г.Минска.

По поводу

Вот проедет барин...

В Минске я живу уже почти тридцать лет. Всякое видела, но такого... На прошлой неделе два дня подряд центральные улицы города были, можно сказать, парализованы. На проспекте Скорины люди в военной форме стояли буквально через каждые пятнадцать—двадцать метров. При этом одни — лицом к проезжей части, другие — наоборот, к пешеходной. То же самое можно было видеть и на проспекте Машерова.

Я понимаю, высоких гостей нужно встречать с почестями, гарантировав полную безопасность. Но, простите, нельзя забывать и о своих гражданах. Улицы перекрываются задолго до движения кортежа, многие опаздывают на работу, в театры, к поездам. Словом, одним — почет, а другим — неудобства. Гостей, конечно, нужно уважать, но надо подумать и о своих людях.

Надежда СМОЛЬСКАЯ.

Всем стоять! Едет правительство...

В минувшую среду, то бишь 12 июля с.г., довелось мне и многим другим минчанам стать свидетелями события чрезвычайного свойства.

Дело происходило в районе водохранилища Дрозды, к вечеру. Возвращался домой народ — кто с работы, кто с грибов-ягод. Однако не всем довелось до автобусной остановки добраться. Неожиданно подкатили тяжелые грузовики, и посыпались из них солдаты. Зазвучали команды, ругань, как водится, и в мгновение ока оцепили служивые проспект Машерова с двух сторон — до кольцевой дороги и, по-видимому, дальше, через населенный пункт Ждановичи. Автомобили с одной стороны исчезли полностью.

Кто-то сунулся дорогу пересечь через цепи.

— Куда! Назад! Пятьдесят метров от дороги шагом марш! — И в матушку, понятно. — Стоять! — это уже другим.

Люди, ничего не понимающие, опешили. Что такое? Кого ловят?

— Видать, преступник опасный сбежал, — многозначительно заметил древний дедок.

— Какой там к черту преступник! — рассмеялся молодой парень. — Наше родное правительство из Заславля везут. Иранскую делегацию отвезли туда на ночевку, а теперь возвращаются назад.

И точно! Минут через двадцать—тридцать появилась огражденная милицейскими мигалками длиннющая кавалькада. Проехала. Все успокоилось.

Не в первый раз наблюдаю, как по нашему проспекту пролетают правительственные автомобили (не зря уже проспект улицей Правительства называют). И спереди, и сзади их милицейские машины с громкоговорителями. Всех прижимают к обочинам, останавливают. Что им до простых людей — едет правительство, едут высокие гости.

А говорят, что новый президент Франции запретил для его машины создавать "зеленую" улицу на любом маршруте. И охрану сократил до предела. Врут, наверно. Не может такого быть!

